УДК 94(476):327“1991/2017”:316.74

# Двухбаковыя культурныя сувязі Рэспублікі Беларусь: фарміраванне дагаворнай базы (1991–2017 гг.)

***Крывашэй Д.А.***
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск*

*Адным з найбольш трывалых і плённых відаў культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца двухбаковыя сувязі. У большасці краін стала традыцыяй замацоўваць двухбаковыя адносіны шляхам падпісання рознага кшталту пагадненняў як на самым высокім узроўні, так і паміж асобнымі ведамствамі, рэгіянальнымі органамі ўлады.*

*Мэта артыкула – абагульненне вопыту фарміравання дагаворнай базы двухбаковага культурнага супрацоўніцтва Беларусі і вызначэнне асноўных тэндэнцый яе развіцця, напрамкаў і краін-партнёраў.*

***Матэрыял і метады.*** *Збор, абагульненне і аналіз звестак аб двухбаковых міжнародных прававых актах у сферы культурных сувязей. Для вызначэння асноўных краін-партнёраў, геаграфічных напрамкаў і тэндэнцый развіцця двухбаковай дагаворнай базы выкарыстаны статыстычныя метады, сістэматызацыя і параўнанне, прынцып гістарызму, гісторыка-генетычны і гісторыка-тыпалагічны падыходы.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Геаграфія краін-партнёраў у перыяд 1991–1996 гг. яскрава сведчыць аб шматвектарнасці знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. У гэтыя гады Беларусь заключыла пагадненні з амаль усімі краінамі-суседкамі, акрамя Латвіі. Актыўнай была дзейнасць па заключэнні пагадненняў з краінамі СНД. Закладзены прававы фундамент стасункаў з асобнымі краінамі Еўропы і Азіі.*

*Другая палова 1990-х гг. – 2001 г. сталі перыядам ахаладжэння двухбаковых адносін з шэрагам краін, у першую чаргу Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, відавочна паступовая змена геаграфіі новых партнёраў. Значна павялічылася дагаворна-прававая база з Расіяй, рабіліся крокі па наладжванні культурнага супрацоўніцтва з краінамі Азіі.*

*У 2002–2012 гг. прасочваюцца дзве фазы ажыўлення з краінамі Еўропы (2002–2005; 2009–2011). Пасля значнага перапынку прадоўжылася практыка заключэння міжведамасных пагадненняў з краінамі СНД (Туркменістан, Таджыкістан). Пашыраліся стасункі з краінамі іншых кантынентаў.*

*Дынаміка заключэння двухбаковых дакументаў у 2013–2017 гг. сведчыць аб актывізацыі азіяцкага вектара культурных кантактаў Беларусі і значным росце (пасля перапынку ў 2002–2014 гг.) дагаворнай базы з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі.*

***Заключэнне.*** *Відавочны ўплыў як унутры-, так і знешнепалітычных фактараў на дынаміку і геаграфію заключэння двухбаковых прававых дакументаў у сферы культурнага супрацоўніцтва.*

*Толькі з асобнымі краінамі Беларусь здолела наладзіць рэгулярнае супрацоўніцтва на аснове канкрэтных праграм і планаў. На працягу ўсяго абазначанага перыяду гэта былі Расія, Літва, Індыя, Кітай. З 2011 г. да іх можна дадаць Арменію.*

***Ключавыя словы:*** *дагаворна-прававая база, двухбаковыя культурныя сувязі, культурнае супрацоўніцтва, знешняя культурная палітыка.*

*(Ученые записки. – 2018. – Том 28. – С. 33–42)*

# Bilateral Cultural Relations of the Republic of Belarus: Contractual Base Formation (1991–2017)

***Kryvashei D.A.***
*Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk*

*One of the most enduring and productive kinds of cultural cooperation is the bilateral ties. The consolidation of bilateral relations through signing agreements of various kinds both at the highest level as well as between individual departments, regional authorities has become a tradition in most countries.*

*The purpose of the study is to generalize the experience of the formation of contractual framework of bilateral cultural cooperation between Belarus and to determine the main trends of its development, directions and partner countries.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: kryvasheidz@gmail.com –* ***Д.А. Крывашэй***

***Material and method.*** *Collection, compilation, and analysis of information on bilateral international instruments used in the field of cultural relations. To determine the main partner countries, geographical areas and development trends of bilateral contractual framework, statistical methods, systematization, and comparison of the principles of historicism, historical, genetic and historical-typological approach have been used.*

***Findings and their discussion.*** *The geography of partner countries in the period of 1991–1996 clearly indicates a multi-vector foreign cultural policy of the Republic of Belarus. During this time frame, Belarus concluded agreements with almost all neighboring countries, except for Latvia. Work was being done on the conclusion of agreements with CIS countries. The legal foundation of the relations with certain countries in Europe and Asia was laid.*

*The preiod from the second half of the 1990s to 2001 was the time of alienating some countries, primarily in Central and Western Europe. The gradual change in the geography of the new partners was visible. The legal base with Russia enlarged. Steps to establishing the cultural cooperation with Asian countries were made.*

*During the period between 2002 and 2012, two phases of revival of connections with Europe were seen (2002–2005, 2009–2011). At that time, the practice of concluding interdepartmental agreements with the CIS countries (Turkmenistan, Tajikistan) continued after a considerable hiatus. Relations with the countries of other continents expanded.*

*In 2013–2017, the dynamics of bilateral agreements indicate the activation of the Asian vector of cultural contacts of Belarus and the considerable growth (after a break in 2002–2014) of the contractual framework with the entities of the Russian Federation.*

***Conclusion.*** *The impact of both internal and foreign policy factors on the dynamics and geography of signing bilateral legal documents in the field of cultural cooperation is visible.*

*Belarus managed to establish a regular cooperation only with certain countries on the base of specific programs and plans. During the entire study period, those countries were: Lithuania, India, Russia, China and Armenia (since 2011).*

***Key words:*** *legal base, bilateral cultural relations, cultural cooperation, foreign cultural policy.*

*(Scientific notes. – 2018. – Vol. 28. – P. 33–42)*

Выхад адноўленай незалежнай Рэспублікі Беларусь на міжнародную арэну патрабаваў самастойнай пабудовы міжнародных стасункаў, пошуку эфектыўных форм прэзентацыі краіны за мяжою. Адным з найбольш трывалых і плённых відаў культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца двухбаковыя сувязі. У большасці краін стала традыцыяй замацоўваць двухбаковыя адносіны шляхам падпісання рознага кшталту пагадненняў як на самым высокім узроўні, так і паміж асобнымі ведамствамі, рэгіянальнымі органамі ўлады.

Мэта артыкула – абагульненне вопыту фарміравання дагаворнай базы двухбаковага культурнага супрацоўніцтва Беларусі і вызначэнне асноўных тэндэнцый яе развіцця, напрамкаў і краін-партнёраў.

**Матэрыял і метады.** Канкрэтнымі міжнароднымі прававымі крыніцамі культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі з'яўляліся дагаворы аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе, міжурадавыя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве; міжведамасныя пагадненні па асобным пытанням культурнага супрацоўніцтва; канкрэтныя міжурадавыя і міжведамасныя планы і праграмы культурных сувязей Рэспублікі Беларусь.

У дадзеным артыкуле мы абагульнілі звесткі аб наяўнай базе двухбаковых нарматыўных прававых актаў, рабочых праграм і пратаколаў у галіне культурнага супрацоўніцтва. Затым з выкарыстаннем статыстычных метадаў, а таксама метадаў сістэматызацыі і параўнання мы паспрабавалі вызначыць асноўныя краіны-партнёры, геаграфічныя напрамкі і тэндэнцыі развіцця двухбаковай дагаворнай базы. Пры аналізе таксама выкарыстаны прынцып гістарызму, гісторыка-генетычны і гісторыка-тыпалагічны падыходы.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Ужо ў Законе “Аб культуры” (ліпень 1991 г.) асобны раздзел (XIII, арт. 49) быў прысвечаны знешнім культурным сувязям. У ім адзначалася, што Рэспубліцы Беларусь належыць выключнае права ўстанаўліваць і развіваць знешнія культурныя сувязі, заключаць міжнародныя дамовы і пагадненні ў галіне культуры, здзяйсняць узаемны абмен дасягненнямі культуры. Прадпрыемствы, установы і арганізацыі культуры, грамадскія аб'яднанні, творчыя саюзы атрымалі права самастойна заключаць дамовы (кантракты) з замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі на любыя формы супрацоўніцтва ў сферы культуры.

З паступовым фарміраваннем самастойнай знешняй палітыкі паўстала задача *ўдасканалення сістэмы сувязей* з замежнымі краінамі ў галіне культуры. У снежні 1991 г. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь накіравала ў Савет Міністраў прапановы па гэтым пытанні [1]. Зыходзячы з таго, што наданне рэспубліцы права самастойнага здзяйснення культурных сувязей з замежнымі краінамі, дэмакратызацыя і дэцэнтралізацыя культурных сувязей, увядзенне ме-

ханізму прамой знешнепалітычнай дзейнасці ў сферы культуры радыкальна змянілі сітуацыю, Міністэрства культуры звяртала ўвагу на тое, што магчымасць удзелу ў міжнародных абменах недастаткова выкарыстоўвалася з-за адсутнасці ўласнай канцэпцыі замежных культурных сувязей. Такая канцэпцыя павінна была мець распрацаваную сістэму нацыянальных прыярытэтаў, якія ўлічвалі б ужо існуючыя сувязі з суседнімі дзяржавамі і рэгіёнамі, замежнымі зямляцтвамі.

Вялікая роля надавалася культурнаму ўзаемадзеянню са славянскімі краінамі. Неабходна адзначыць, што наша рэспубліка, калі яшчэ знаходзілася ў складзе СССР, на ўзроўні Міністэрства культуры заключыла дагаворы аб прамым культурным супрацоўніцтве з Польшчай, Славеніяй, Славакіяй.

Другім напрамкам бачылася ўстанаўленне прамых культурных кантактаў з краінамі Бенілюксу, Германіяй, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Скандынаўскімі краінамі.

Новай дамінантай культурнай палітыкі рэспублікі павінны былі стаць узаемаадносіны з беларускім зямляцтвам за мяжою. Прапаноўвалася гэтыя пытанні выносіць на абмеркаванне пры правядзенні перамоў з ЗША, Канадай, Аўстраліяй, Аргенцінай і інш.

У наступныя гады работа над канцэпцыяй знешняй палітыкі Беларусі ў галіне культуры працягвалася. Першая спроба яе прыняцця як асобнага дакумента была ў кастрычніку 1995 г. на калегіі Міністэрства культуры і друку. У ім у якасці прыярытэтных краін для культурнага супрацоўніцтва былі вызначаны Расія, Украіна, Літва, Польшча, Латвія, ФРГ, Францыя, Вялікабрытанія, Славакія, Малдова, Эстонія, Чэхія, Славенія, Румынія, Балгарыя, Турцыя, КНР і ЗША [2]. Але дакумент так і не быў зацверджаны. У хуткім часе змяніліся і знешнепалітычныя ўмовы.

За развіццё міжнародных культурных кантактаў у абазначаны перыяд адказвала Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якое рэалізоўвала задачы знешняй культурнай палітыкі ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам замежных спраў, дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі, дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі розных узроўняў.

У сувязі з павелічэннем аб’ёму міжнародных сувязей Міністэрства культуры і ўстаноў, што яму падпарадкоўваліся, неабходнасцю распрацоўкі і своечасовага прыняцця рашэнняў па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне культуры ў пачатку 1993 г. быў створаны Савет па міжнароднай дзейнасці Міністэрства культуры [3].

Першыя міжурадавыя пагадненні, у якіх закраналіся і пытанні супрацоўніцтва ў сферы культуры, былі заключаны ў 1992 г. з Кітаем і Польшчай. Найбольшай плённасцю характарызаваўся 1995 г., калі было заключана сем толькі міжурадавых пагадненняў і дэкларацый. Геаграфія краін-партнёраў яскрава сведчыць аб шматвектарнасці знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у гэты перыяд. Побач з краінамі-суседкамі (Польшча, Літва, Украіна, Расія) прысутнічалі такія краіны Еўропы, як Балгарыя, Румынія, Вялікабрытанія, Югаславія, Славакія і Італія, краіны СНД (Малдова, Казахстан, Азербайджан, Узбекістан і Таджыкістан), а таксама азіяцкія краіны (Кітай, Індыя, Іран, Турцыя).

Яшчэ ў рамках СССР 5 лютага 1989 г. у г. Мінску было заключана міжведамаснае пагадненне з Літвою на трохгадовы тэрмін з працягам. Перазаключэнне адбылося ў 1993 г. Артыкулам 12 гэтага пагаднення прадугледжваліся штогадовая падрыхтоўка і зацвярджэнне праграм канкрэтнага супрацоўніцтва, умовы арганізацыі і фінансавання [4]. У далейшым падобныя праграмы заключаліся на два гады.

Двухбаковыя пагадненні заключалі і асобныя рэгіёны. Напрыклад, у 1992 г. Мінск і Лодзь падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве, у якім увага была нададзена і культурнаму напрамку [5, с. 96]. У сакавіку 1996 г. Гродзенскі аблвыканкам і аддзел культуры, спорту і турызму ваяводскай управы ў Беластоку падпісалі пагадненне аб культурным супрацоўніцтве на 1996–1998 гг. [6, с. 214].

Другая палова 1990-х гг. стала перыядам ахаладжэння двухбаковых адносін з шэрагам краін, у першую чаргу Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Амаль праз год пасля праведзенага ў лістападзе 1996 г. у Беларусі рэферэндуму Рада міністраў замежных спраў Еўрапейскага саюза разгледзела сітуацыю ў краіне і прыняла рашэнне аб мінімізацыі афіцыйных кантактаў. Савет Еўропы адклікаў у Беларусі статус “спецыяльнага госця”.

У той жа час інтэграцыя з Расіяй, што распачалася ў 1996 г., прывяла да значнага павелічэння ў 1996–2001 гг. дагаворна-прававой базы з гэтай краінай. Пры гэтым развівалася супрацоўніцтва з рэгіёнамі. Былі заключаны міжведамасныя пагадненні з Мурманскай, Калінінградскай і Саратаўскай абласцямі, Краснадарскім краем, міжведамасны пратакол з адміністрацыяй Санкт-Пецярбурга. Міжведамасны пратакол быў заключаны і з аўтаномнай Рэспублікай Крым (Украіна). У гэты час былі заключаны міжурадавыя пагадненні з Сірыяй і Ізраілем (табл.).

Табліца

**Дынаміка заключэння Рэспублікай Беларусь двухбаковых міжнародных прававых актаў, якія рэгулявалі адносіны ў галіне культуры (1991–2017 гг.) [10–12]**

| | Пагадненні, дэкларацыі | | Міжведамасныя пратаколы | Праграмы, планы |
|---|---|---|---|---|
| | Міжурадавыя | Міжведамасныя | | |
| 1991 | Славенія (03.06.) | Эстонія (дэкларацыя, 13.12.) | | |
| 1992 | Кітай (25.11.)<br>Польшча (18.11.) | Мары Эл (Расія, 09., на 1992–1993) | | Польшча (на 2 гады) |
| 1993 | Індыя (14.05.)<br>Балгарыя (19.10.) | Літва (05.02.)<br>Украіна (10.02.) | | Літва (05.02., на 2 гады) |
| 1994 | Германія (03.03., не ўступіла ў сілу, аднак прымянялася з дня падпісання)<br>Узбекістан (міждзярж., 22.12.) | | Славакія (12.05., на 1994–1995) | |
| 1995 | Расія (21.01.)<br>Польшча (25.03.; 27.11.)<br>Румынія (07.05.)<br>Іран (14.07.)<br>Вялікабрытанія (25.07.)<br>Турцыя (08.08.) | Малдова (11.09.) | Кітай (14.12., на 3 гады)<br>Польшча (03., на 1995–1996) | |
| 1996 | Казахстан (17.01.)<br>Югаславія (06.09.)<br>Таджыкістан (15.05., не ўступіла ў сілу) | Азербайджан (06.03.)<br>Расія (Калінінградская вобл., 02.10.) | Расія (кіно, 19.04., на 2 гады)<br>Расія (Масква, 14.10., на 3 гады) | Італія (міжурад. рабочая праграма на 4 гады, 27.09.) |
| 1997 | | Польшча (06.03., на 4 гады)<br>Куба (15.09.) | Расія (28.01., на 1 год)<br>Польшча (06.03., на 1 год)<br>Расія (Адміністрацыя Санкт-Пецярбурга, 16.05., на 2 гады) | План сумесных мерапрыемстваў у рамках Садружнасці Беларусі і Расіі (28.01., на 1 год)<br>Украіна (міжвед., 12.05., на 2 гады) |
| 1998 | Сірыя (11.03.) | Расія (Мурманская вобл., 28.09., на 3 гады) | Кітай (на 3 гады)<br>Расія (10.02., на 1 год) | Індыя (міжурад., на 3 гады) |
| 1999 | | Казахстан (04.11.)<br>Расія (Краснадарскі край, 17.03., на 2 гады)<br>Расія (Саратаўская вобл., 15.04., на 5 гадоў) | Украіна (Рэспубліка Крым, 18.02., на 5 гадоў) | |

*Працяг табл.*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2000 | Ізраіль (11.04., ратыфікавана Беларуссю 07.05.2007 г.) | | | Украіна (міжвед., 08.07., на 3 гады)<br>Турцыя (міжурад., 15.11., на 3 гады) |
| 2001 | | Расія (Мурманская вобл., 28.03., на 3 гады)<br>Расія (Краснадарскі край, 13.08., на 4 гады)<br>Малдова (28.08.)<br>Літва (22.11.) | Кітай (24.04., на 3 гады)<br>Расія (13.12., на 1 год) | Індыя (міжурад., 15.11., на 4 гады)<br>Літва (22.11., на 2 гады) |
| 2002 | Курская вобл. (Расія, 25.01.) | Латвія (18.04., на 3 гады) | | |
| 2003 | | Арменія (17.10.) | Украіна (16.06.)<br>Расія (21.01., на 1 год)<br>Кітай (28.11., на 3 гады) | |
| 2004 | Егіпет (24.06.)<br>Іран (10.09.) | Ліван (07.06.)<br>Эстонія (24.08.)<br>Польшча (09.12., на 2 гады) | Балгарыя (27.07., на 2 гады)<br>Расія (на 1 год) | |
| 2005 | | Славакія (18.10.) | | Літва (28.09., на 2 гады) |
| 2006 | Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (28.08.) | | Сірыя (13.04., на 3 гады)<br>Расія (24.01., на 1 год) | |
| 2007 | Паўднёвая Карэя (05.11.)<br>Венесуэла (міждзярж., 08.12.) | В'етнам (21.12.) | Кітай (05.11., на 3 гады)<br>Турцыя (18.04.)<br>Расія (г. Масква, 02.04.) | Індыя (міжурад., 16.04., на 3 гады)<br>Літва (04.10., на 2 гады) |
| 2008 | | | Расія (12.07., на 2 гады)<br>Кыргызстан (11.10., на 4 гады) | Расія (г. Масква, 15.01., на 2 гады)<br>Арменія (20.05., на 3 гады) |
| 2009 | Катар (13.04., на 5 г. з праланг.)<br>Венгрыя (14.05., бестэрмін.)<br>Расія (аб культ.-інф. цэнтрах, 10.12., на 5 г. з праланг.) | Літва (ахова спадч., 12.09., на 5 г. з праланг.)<br>Туркменістан (19.06., на 5 г. з праланг.) | | |

*Працяг табл.*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2010 | Украіна (29.04.)<br>Францыя (20.01., на 5 г. з праланг.) | | | Літва (09.03., на 2010–2011)<br>Сірыя (28.04.)<br>Украіна (29.04., на 2010–2013)<br>Расія (29.11., на 2011–2012)<br>Расія (г. Масква, на 2 гады) |
| 2011 | Італія (10.06., бестэрм.) | Таджыкістан (27.10., на 5 г. з праланг.) | | Арменія (19.05., на 2011–2013) |
| 2012 | | | | Польшча (19.11., на 2012–2014)<br>Сербія (28.10., на 2012–2017) |
| 2013 | Азербайджан (барацьба з крадзяжамі культ. кашт., 28.08., на 5 г. з праланг.) | | | Індыя (міжурад., 17.10., на 2014–2016)<br>Латвія (на 2013–2015) |
| 2014 | | Кітай (мемарандум, 27.09.)<br>Шры-Ланка (08.09., на 5 г. з праланг.)<br>Расія (Свярдлоўская вобл., 06.10.) | | Арменія (17.10., на 2014–2017)<br>Туркменістан (міжурад., 08.10., на 2015–2016 з планам)<br>Катар (міжурад., 18.07., на 2011–2013)<br>В’етнам (03.11., на 2014–2016)<br>Курская вобл. (Расія, міжурад., на 2015–2016) |
| 2015 | Расія (Архангельская вобл., 07.04., на 5 г. з праланг.)<br>Расія (Яраслаўская вобл., 19.11., бестэрм.)<br>Расія (18.09., Белгародская вобл., Сахалінская вобл., Цюменская вобл., Камчацкі край, на 5 г. з праланг.; Пензенская вобл., бестэрм.)<br>Расія (17.09. Уладзімірская вобл., на 5 г. з праланг.)<br>Кітай (аб культурных цэнтрах, 10.05., на 5 г. з праланг.)<br>Аўстралія (мемарандум, 24.02., на 5 г. з праланг.) | | | |

*Заканчэнне табл.*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2016 | ЗША (ахова і захаванне некаторых культ. каштоўнасцей; 21.09., бестэрм.)<br>Расія (Іркуцкая вобласць, 06.12., на 5 г. з праланг.)<br>Расія (08.06., Пермскі край, Томская вобл. – бестэрм.; Хакасія, на 5 г. з праланг.)<br>Расія (Арлоўская вобл., 24.03., на 5 г. з праланг.) | ААЭ (мемарандум, 16.12., на 3 гады з праланг.) | | Туркменістан (міжурад., 11.05., на 2017–2020)<br>Венгрыя (29.09., на 5 г. з праланг.)<br>Літва (29.04., на 2016–2018)<br>Латвія (10.06., на 2016–2018) |
| 2017 | Расія (Тамбоўская вобл., 25.10., на 5 г. з праланг.)<br>Расія (Чувашская Рэспубліка, 28.08., на 5 г. з праланг.)<br>Расія (29.06., Пскоўская вобласць, Разанская вобласць, Чачэнская Рэспубліка, на 5 г. з праланг.; Мардовія – бестэрм.)<br>Расія (Стаўрапольскі край, 16.03., бестэрм.)<br>Расія (Кастрамская вобласць, 07.02., на 5 г. з праланг.) | Грузія (16.11., на 5 г. з праланг.)<br>Кітай (31.05., на 5 г. з праланг.)<br>Куба (12.04., на 5 г. з праланг.)<br>Македонія (мемарандум, 23.03., на 5 г. з праланг.)<br>Манголія (06.02., на 5 г. з праланг.)<br>Егіпет (мемарандум, 15.01., на 5 г. з праланг.)<br>Казахстан (мемарандум, 29.11.) | Туркменістан (міжурад., 30.03., на 2017–2020) | Індыя (міжурад., 12.09., на 2018–2020)<br>Украіна (21.07., на 2017–2021)<br>Малдова (міжурад., чэрвень, на 2017–2019)<br>В’етнам (на 2017–2019) |

У аналітычнай запісцы ў адрас Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у чэрвені 1998 г. адзначалася, што “Міністэрства культуры пры здзяйсненні культурных кантактаў з замежнымі краінамі арыентуецца на шматвектарнасць знешнепалітычнай дактрыны дзяржавы і прынцыпы прыярытэтнасці ў выбары партнёраў”. Такімі прыярытэтамі называліся: “Расійская Федэрацыя (Камітэт Расійскай Федэрацыі па кінематаграфіі, Міністэрства культуры, суб’екты і рэгіёны Расійскай Федэрацыі як самастойныя дзелавыя партнёры); дзяржавы СНД; краіны-суседзі (за выключэннем вышэйзгаданых); Кітай, Індыя, Карэя, Японія; Германія, Францыя, Англія, Італія і іншыя еўрапейскія дзяржавы; Куба і іншыя лацінаамерыканскія краіны; ЗША і іншыя дзяржавы Паўночнай Амерыкі” [7, арк. 15–16]. Міністэрства культуры падкрэслівала, што пры распрацоўцы і заключэнні пагадненняў міждзяржаўнага, міжурадавага і міжведамаснага ўзроўняў “мы сыходзім не з колькасных паказчыкаў падпісання міжнародных дакументаў па прынцыпе «чым болей, тым лепей». Асноватворным фактарам тут выступае захаванне знешнепалітычных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, магчымасць выхаду на рынак культурных паслуг той ці другой краіны, багацце і асаблівасці культурных традыцый і шмат іншых фактараў” [7, арк. 20]. Як паказала практыка, менавіта “іншыя фактары” адыгрывалі істотную ролю ў дынаміцы асобных вектараў знешняй культурнай палітыкі нашай дзяржавы.

У ліпені 1998 г. у выніку канфлікту, звязанага з прымусовым высяленнем паслоў 22 краін з рэзідэнцый у Драздах, краіны ЕС уводзяць першыя ў гісторыі візавыя абмежаванні для беларускага ўрада. Гэты пакет санкцый пратрымаўся менш за год (9.07.1998 – люты 1999).

Палітычная сітуацыя адбілася і на культурных сувязях. Шэраг еўрапейскіх краін пачалі прытрымлівацца палітыкі "крытычнага дыялогу" ў дачыненні да Беларусі. У выніку была прыпынена распрацоўка шэрага міжнародных пагадненняў і рабочых дакументаў планавага характару. Напрыклад, у 1999 г. была прыпынена распрацоўка міжведамаснага пратакола Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча аб супрацоўніцтве. Пратакол аб супрацоўніцтве з Польшчай (1997 г.) стаў адным з апошніх міжнародных пагадненняў, заключаных Рэспублікай Беларусь з дзяржавамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Міністэрства культуры неаднаразова звярталася да адпаведных структур еўрапейскіх дзяржаў з прапановамі аб далейшай распрацоўцы міжведамасных пагадненняў. Аднак па прычынах палітычнага характару з боку замежных партнёраў гэтыя звароты не атрымалі належнага адказу [8, с. 54].

Еўрапейскі вектар у дагаворнай базе зноў стаў пераважаць у 2002–2005 гг. У 2002 г. было падпісана міжведамаснае пагадненне з Латвіяй (2002). У 2004 г. міністр культуры Рэспублікі Беларусь Л.П. Гуляка наведаў з рабочым візітам Эстонію для падпісання міжведамаснага пагаднення з Міністэрствам культуры Эстонскай Рэспублікі. У снежні таго ж года была адноўлена практыка заключэння міжведамасных пагадненняў з Польшчай. Папярэдні дакумент быў заключаны ў 1997 г. і быў разлічаны на тэрмін па 2000 г. уключна. Новае пагадненне было падпісана на два гады. Па словах Леаніда Гулякі, гэтым дакументам Міністэрства культуры "завяршыла фарміраванне своеасаблівага «пояса добрасуседства» з усімі сумежнымі дзяржавамі" [9, арк. 40]. У кастрычніку 2005 г. падобнае пагадненне было падпісана са Славакіяй. Працягваліся рабочыя кантакты з Літвою. Міжведамасны пратакол быў падпісаны з Балгарыяй (2004 г.).

Новы раўнд у фарміраванні дагаворнай базы з краінамі Еўропы прыпадае на 2009–2011 гг. У 2009 г. былі заключаны міжурадавыя пагадненні аб супрацоўніцтве з Венгрыяй, у 2010 г. – з Францыяй, у 2011 г. – з Італіяй. Толькі ў 2010 г. міністр культуры П. Латушка правёў перамовы з міністрамі культуры Літвы, Польшчы, Сербіі, Чэхіі, Латвіі, главамі дыпламатычных прадстаўніцтваў Італіі, Чэхіі, Славакіі, Грузіі, Украіны. Праграмы і планы двухбаковых кантактаў былі падпісаны з Літвою, Украінай, Расіяй, Арменіяй, Польшчай і Сербіяй.

У гэтыя ж гады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пасля значнага перапынку вярнулася да пытання пашырэння дагаворнай базы з краінамі СНД. Міжведамасныя пагадненні былі заключаны з Туркменістанам (2009 г.) і Таджыкістанам (2011 г., пагадненне 1996 г. не ўступіла ў сілу). Адзначым, што Кыргызстан заставаўся адзінай краінай-удзельніцай СНД, з якой да канца 2017 г. не было заключана ніякіх двухбаковых прававых актаў, якія б тычыліся культурнага супрацоўніцтва.

Працягваліся пошук і наладжванне стасункаў з краінамі Лацінскай Амерыкі, Азіі, Афрыкі. Відавочная пераарыентацыя на іх адбылася ў 2004 г., калі былі заключаны міжурадавыя пагадненні з Егіптам і Іранам, міжведамаснае пагадненне з Ліванам. Да гэтага за 1996–2003 гг. не было падпісана ніводнага новага міжнароднага двухбаковага пагаднення з краінамі з гэтых рэгіёнаў. У 2006–2007 гг. міжурадавыя пагадненні былі заключаны з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай, Паўднёвай Карэяй, Венесуэлай, міжведамаснае пагадненне з В'етнамам і Ліванам, у 2010 г. – з Катарам.

У 2014–2017 гг. культурныя кантакты на ўзроўні падпісання афіцыйных двухбаковых прававых дакументаў наладжваюцца з такімі геаграфічна аддаленымі краінамі, як Аўстралія, Інданезія, Пакістан, ААЭ, Манголія. У 2016 г. міжурадавае пагадненне аб ахове і захаванні некаторых культурных каштоўнасцей было заключана з ЗША. У 2017 г. упершыню было заключана міжведамаснае пагадненне аб культурным супрацоўніцтве з такімі краінамі Еўропы, як Грузія і Македонія. У 2015–2017 гг. хуткімі тэмпамі расце колькасць заключаных двухбаковых пагадненняў з рэгіёнамі Расіі (2015 г. – 8 рэгіёнаў; 2016 г. – 5; 2017 г. – 8).

Нягледзячы на істотную колькасць заключаных міжурадавых і міжведамасных пагадненняў і дэкларацый, якія тычыліся культурнага супрацоўніцтва, толькі з асобнымі краінамі Беларусь здолела наладзіць рэгулярнае супрацоўніцтва на аснове канкрэтных праграм і планаў. На працягу ўсяго абазначанага перыяду гэта былі Літва, Індыя, Расія, Кітай. З 2011 г. да іх можна дадаць Арменію.

Заключаныя пагадненні прадстаўлялі магчымасці для шырокага супрацоўніцтва ў сферы культуры. Напрыклад, Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Італьянскай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, заключанае 10 чэрвеня 2011 г., вызначала разнастайныя формы супрацоўніцтва [13]. Сярод іх: арганіза-

цыя мерапрыемстваў у галіне культуры і мастацтва; спрыянне прамым кантактам паміж установамі, арганізацыямі і асацыяцыямі, творчымі саюзамі, абмену спецыялістамі, выканаўцамі і творчымі калектывамі, узаемнаму ўдзелу ў міжнародных творчых конкурсах і фестывалях; садзейнічанне арганізацыі гастроляў і выступленняў тэатральных груп і асобных артыстаў, правядзенню музейных выставак; абмен інфармацыяй, рэкламнымі матэрыяламі і публікацыямі ў сферы культуры; пераклад літаратурных твораў, а таксама навуковых прац у галіне культуры.

Асобнымі артыкуламі пагаднення прадугледжвалася: а) заахвочванне супрацоўніцтва ў галіне папулярызацыі, вывучэння, захавання, аховы і рэстаўрацыі гістарычнай і культурнай спадчыны; б) развіццё супрацоўніцтва па процідзеянню незаконнаму абароту культурных каштоўнасцей; в) умацаванне двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне абароны аўтарскіх і сумежных правоў у сферы культуры; г) садзейнічанне ў дзейнасці на тэрыторыі сваёй краіны культурных устаноў другога боку: італьянскіх інстытутаў культуры ў Рэспубліцы Беларусь і беларускіх культурных цэнтраў у Італьянскай Рэспубліцы; д) спрыянне дзейнасці на тэрыторыі сваіх дзяржаў асацыяцый культуры дзяржавы другога боку, у тым ліку камітэтаў Таварыства імя Дантэ Аліг'еры; е) стварэнне сумеснай беларуска-італьянскай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне культуры.

Кожная з краін выказала намер спрыяць атрыманню доступу спецыялістаў да адпаведных устаноў культуры і навукі, архіваў, музеяў, бібліятэк. Асаблівая ўвага ў пагадненні была звернута на спрыянне супрацоўніцтву паміж краінамі ў мэтах рэалізацыі палажэнняў Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ад 17 кастрычніка 2003 года, Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ад 16 лістапада 1972 года, Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення ад 20 кастрычніка 2005 года, Канвенцыі аб захадах, накіраваных на забарону і папярэджванне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці ад 14 лістапада 1970 года.

З улікам мэтазгоднасці актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва ў рамках праграм ЮНЕСКА, Еўрапейскага саюза, Савета Еўропы, Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы і іншых міжнародных інстытутаў урады абедзвюх краін узялі на сябе абавязацельствы па пошуку і спрыянню сумеснаму ўдзелу ў гэтых праграмах.

Але нельга лічыць, што падпісанае пагадненне стала нейкім “ключом” да актывізацыі кантактаў. Яго наяўнасць хутчэй з'яўлялася дэманстрацыяй палітычных намераў. Неабходна таксама ўлічваць, што не з усімі краінамі падобная практыка была магчымай па прычыне іншай культуры. Напрыклад, Пасол Японіі ў Беларусі Сігэхіра Міморы, які адпрацаваў у Беларусі з 2012 па 2016 г., на пытанне, што было самым складаным за час працы ў Беларусі, адказаў: “Асноўная складанасць у маёй працы заключалася ў тым, што ў беларусаў і японцаў некалькі розныя падыходы да арганізацыі і вядзення спраў. Мы ў Японіі пачынаем з малога і невялікімі крокамі паступова прасоўваемся наперад да пастаўленай мэты, а ў вас у Беларусі імкнуцца пачаць адразу з нечага вялікага і значнага. Японцы ставяць на мэце спачатку назбіраць практычны вопыт паспяховых дзелавых праектаў і потым на падставе дасягнутага будаваць больш глыбокія адносіны. У Беларусі вельмі часта ўсё адбываецца наадварот – спачатку заключаюцца пагадненні на высокім узроўні і толькі потым у рамках гэтых пагадненняў пачынаюцца нейкія крокі і практычныя дзеянні”. Менавіта такі розны падыход перашкаджаў супрацоўніцтву. Пасол адзначаў: “За час сваёй працы ў Беларусі я неаднаразова сутыкаўся з такімі сітуацыямі ў самых розных абласцях супрацоўніцтва. У сувязі з гэтым мне як главе дыпламатычнага прадстаўніцтва Японіі ў Беларусі і пасярэдніку паміж японскім і беларускім бокам было дастаткова складана знаходзіць рашэнні, якія б задавальнялі пажаданні абодвух бакоў” [14, с. 38].

Як паказвае практыка, адсутнасць падпісаных пагадненняў, пратаколаў, планаў, праграм і да т.п. не перашкаджала дастаткова плённаму і рэгулярнаму культурнаму супрацоўніцтву. Але гэта тэма асобнага даследавання.

**Заключэнне.** На канец 2017 г. Рэспубліка Беларусь мела звыш за 90 двухбаковых міжнародных прававых актаў, якія рэгулявалі адносіны ў галіне культуры. З асобнымі краінамі было заключана па некалькі дакументаў. Пагадненні былі падпісаны з усімі краінамі-суседкамі, амаль з усімі краінамі СНД (за выключэннем Кыргызстана) і Грузіяй. Міжурадавыя або міжведамасныя пагадненні і дэкларацыі былі таксама заключаны з 11 краінамі Еўропы (без уліку краін-суседак і краін СНД), 16 краінамі Азіі, дзвюма краінамі Афрыкі і дзвюма краінамі Лацінскай Амерыкі. Асобныя пагадненні былі заключаны з ЗША і Аўстраліяй. Заўважаецца значная скіраванасць на рэгіёны Расійскай Федэрацыі. На іх прыпадае звыш за 30% усіх пагаднен-

няў (дэкларацый). Прычым большасць з іх была падпісана ў 2015–2017 гг. (21 з 29).

На дынаміку і геаграфію заключэння двухбаковых прававых дакументаў у сферы культурнага супрацоўніцтва аказвалі ўплыў як унутры-, так і знешнепалітычныя фактары.

Геаграфія краін-партнёраў у перыяд 1991–1996 гг. яскрава сведчыць аб шматвектарнасці знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Адметным з'яўляецца факт заключэння першых міжурадавых дакументаў аб культурным супрацоўніцтве з такімі блізкімі па культуры краінамі, як Польшча і Балгарыя, і такімі геаграфічна і культурна далёкімі, як Кітай і Індыя. У гэтыя гады Беларусь заключыла пагадненні з амаль усімі краінамі-суседкамі, акрамя Латвіі. Актыўнай была дзейнасць па заключэнні пагадненняў з краінамі СНД.

Другая палова 1990-х гг. – 2001 г. сталі перыядам ахаладжэння двухбаковых адносін з шэрагам краін, у першую чаргу Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. У абазначаны перыяд відавочна паступовая змена геаграфіі новых партнёраў. Інтэграцыя з Расіяй, што распачалася ў 1996 г., прывяла да значнага павелічэння ў 1996–2001 г. дагаворна-прававой базы з гэтай краінай, рабіліся крокі па наладжванні культурнага супрацоўніцтва з іншымі рэгіёнамі і краінамі.

У 2002–2012 гг. прасочваюцца дзве фазы ажыўлення з краінамі Еўропы (2002–2005; 2009–2011). Пасля значнага перапынку прадоўжылася практыка заключэння міжведамасных пагадненняў з краінамі СНД (Туркменістан, Таджыкістан). Пашыраліся стасункі з краінамі іншых кантынентаў.

Дынаміка заключэння двухбаковых дакументаў у 2013–2017 гг. сведчыць аб актывізацыі азіяцкага вектара культурных кантактаў Беларусі і значным росце (пасля перапынку ў 2002–2014 гг.) дагаворнай базы з суб'ектамі Расійскай Федэрацыі (21 пагадненне).

Аналіз дадзеных аб двухбаковых праграмах і планах дазваляе вылучыць краіны, з якімі сувязі на працягу ўсяго абазначанага перыяду мелі рэгулярны характар. Гэта Літва, Індыя, Расія, Кітай. З 2011 г. да іх можна дадаць Арменію.

## Літаратура


1. Предложения о совершенствовании системы связей с зарубежными странами в области культуры. Письмо Министерства культуры Республики Беларусь в Совет Министров Республики Беларусь. Копия. 31.12.1991 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). – Фонд 974. – Воп. 1. – Спр. 2060. – Арк. 241–245.
2. Пратакол пасяджэння калегіі Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь № 10 ад 25 кастрычніка 1995 г. Арыгінал // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 1. – Спр. 46. – Арк. 4–10.
3. Аб стварэнні Савета па міжнароднай дзейнасці Міністэрства культуры. Загад міністра культуры Рэспублікі Беларусь № 1 ад 06.01.1993 г. Арыгінал // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 1. – Арк. 1–2.
4. Праграма культурнага супрацоўніцтва і абмену паміж Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам культуры і адукацыі Літоўскай Рэспублікі на 1993–94 гады. Копія // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 37. – Арк. 4–6.
5. Лазоркина, О. Сотрудничество городов как фактор укрепления белорусско-польского добрососедства / О. Лазоркина // Актуальныя пытанні беларуска-польскіх адносін: матэрыялы беларуска-польскага круглага стала / рэд.: В. Шадурскі [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2012. – С. 94–99.
6. Пагадненні аб культурным супрацоўніцтве ўстаноў Гродзеншчыны і Польшчы (1991–1996 гг.) // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна, 5–6 снеж. 1997 г. / пад рэд. І.П. Крэня. – Гродна: ГрДУ, 1998. – С. 213–215.
7. Информация о проведении Министерством культуры Республики Беларусь внешнеполитической пропаганды посредством международных культурных связей (1997–1998). Копия // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 217. – Арк. 15–49.
8. Шадурский, В.Г. Внешняя культурная политика Республики Беларусь: состояние и проблемы / В.Г. Шадурский // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2000. – № 2. – С. 50–56.
9. Выступление министра культуры Республики Беларусь Л.П. Гуляко на итоговой коллегии Министерства культуры Республики Беларусь за 2004 год // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 1046. – Арк. 33–57.
10. Перечень международно-правовых актов Республики Беларусь, регулирующих отношения в области образования, культуры, искусства, средств массовой информации, спорта и туризма (по состоянию на 05.05.98). Копия // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 220. – Арк. 111–113.
11. Пералік міжнародных дагавораў у галіне культуры (па стане на студзень 2002 г.) [Электронны рэсурс]. – 2002. – Рэжым доступу: http://library.by/portalus/modules/belarus/referat_readme.php?subaction=showfull&id=1096040150&archive=&start_from=&ucat=1&. – Дата доступу: 09.10.2018.
12. База данных "Эталон-онлайн".
13. Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Італьянскай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў галіне культуры ад 10 чэрвеня 2011 г. Зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 снежня 2011 г. № 1727 "Аб зацвярджэнні Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Італьянскай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў галіне культуры" // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2012. – № 1. – 5/34985.
14. Три вопроса на прощание. Экс-Временный Поверенный в делах, Посол Японии в Республике Беларусь Сигэхиро Мимори: "Надеюсь, что деревья сакуры приживутся в Минске" / Текст: Наталья Кривец // DipService. – 2016. – № 10. – С. 34–38.


*Паступіў у рэдакцыю 11.12.2018 г.*